View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Казкі і паданні як сродак этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту

Дз. М. Дубініна, канд. пед навук, дацэнт БДПУ

У народнай педагогіцы ад бацькі і маці да сына і дачкі перадаваліся сакрэты працоўнага майстэрства. Дзеці з малку прывучваліліся да карыснай справы, авалодвалі уменнем выконваць работу добра і хутка. Малыя ведалі, што не тое дарага, что блішчыць нібы золата, а тое дарага, што зроблена добрым майстрам. Сёння ўжо мала засталося майстроў, якія самастойна, толькі рукамі і нескладанымі прыладамі працы вырабляюць карысныя і прыгожыя рэчы, але застаўся след працы людской. Рэчы, што зроблены народнымі майстрамі, захоўваюцца ў краязнаўчых музеях. Іх можна сустрэць у хатняй гаспадарцы вясковых жыхароў.

Прапаноўваем увазе педагогаў серыю камунікатыўна-адукацыйных сітуацый “Па рабоце майстра знаць”, якія накіраваны на азнаямленне дашкольнікаў з працай народных майстроў.

**Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя “ След працы людской”**

***1.Чытанне ўрыўка з апавядання В. Віткі “ След працы людской” і размова па зместу твора .***

**След працы людской**

“Не толькі імёны людскія ўвекавечваліся ў памяці гарадоў і вёсак, а і справы, і рамёствы, і праца нашых продкаў, якою яны займаліся.

Болей за сотню налічыў я назваў, якія чутны на ўсёй Беларусі і паходзяць ад слова “ руда”: Рудня, Рудніца, Руднае, Рудавец, Рудаўка, Рудка, Рудзянец, Рудзенск, Рудаўляны, Рудзевічы, Руднікі... У далёкім мінулым усё гэта былі прамысловыя паселішчы. Дзе з балотнай руды выплаўлялі жалеза. У нас каля паўсотні паселішчаў з назваю Гута, якая сведчыць аб даўнім развіцці ў Беларусі шкляных заводаў: Гутка, Гутніца, Гутава, Гута Замошская, Гута Ляшчынская, Новая Гута, Старая Гута, Студзёная Гута. Шкляныя вырабы гуты “Нёмане, што на Гродзеншчыне, цяпер шырока

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вядомыя ў нас і за мяжою. Майстроў і рабочых, якія вырабляюць шкло, завуць гутнікі.

Паселішча Бандары, пэўна ж, выславілася некалі майстрамі, якія рабілі на патрэбу людзям добрыя бочкі, цэбры, дзежкі. У Бортніках не зводзіліся знаўцы, якія ведалі, дзе, ў якіх лясах поўна ў дуплах дзікіх пчол. Паступова прывучалі іх насіць мёд у вуллі-борці, што рабілі з тоўстых калод і ставілі на дрэвах, каб мядзведзь не дастаў.

Сітнікі выраблялі сіты і рашоты. Суднікі – драўляны посуд: лыжкі, міскі, каўшы, кадаўбцы.

Дойліды былі выдатнымі будаўнікамі".

Паводле В.Віткі.

2. ***Размова пасля чытання.***

- Што, акрамя людскіх імёнаў, увекавечвалася ў назвах паселішчаў?
- Так, у назвах паселішчаў увекавечваліся справы, рамёствы, след працы нашых продкаў.
- Як называлі паселішчы, дзе з балотнай руды выплаўлялі жалеза?
- Назвы якіх паселішчаў сведчаць аб даўнім развіцці ў Беларусі шкляных заводаў?
- Якія паселішчы выславілася некалі майстрамі, што рабілі на патрэбу людзям добрыя бочкі, цэбры, дзежкі?
- Што выраблялі ў паселішчах Сітнікі і Суднікі?
- Як называліся паселішчы, дзе жылі выдатныя будаўнікі?

3. ***Народная гульня " Работнікі"***

Пагуляем разам з вамі ў народную гульні " Работнікі". Спачатку выбярэм вядучага – "майстра" .

Майстар становіцца ў сярэдзіну круга і гаворыць:

-- Мы ўмелыя работнікі,

Аратыя і плотнікі, сена косім, будуем дом, што мы робім сякерай? – і ўказвае на аднаго з гуляючых, якому неабходна адказаць на пытанне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасля майстар называе другі інструмент  і ўказвае на гуляючага, якому пажадана назваць дзеянне з гэтым інструментам. ( тапаром -- рубім, касой -- косім, рубанкам -- стругаем, нажом – рэжам і г.д.).

4. ***Прыказкі і прымаўкі пра добрую працу.***

Пра працу і таго, хто любіць працаваць у народзе казалі:

Хто працуе, таму і … шанцуе.

Хто працуе, той …  святкуе.

Добра рабі, добра і …  будзе.

**Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя “ Прамысловыя паселішчы ад слова “руда”.**

***1. Размова з дзецьмі.***

- “На Беларусі  маецца многа назваў, якія  паходзяць ад слова “ руда”. Гэта: Рудня, Рудніца, Руднае, Рудавец, Рудаўка, Рудка, Рудзянец, Рудзенск, Рудаўляны, Рудзевічы, Руднікі... У далёкім мінулым усё гэта былі прамысловыя паселішчы”.( паводле В. Віткі)
- Што выраблялі ў гэтых паселішчах? *(З балотнай руды выплаўлялі жалеза. )*
- Якія вырабы з жалеза вы ведаеце? Назавіце іх.
- Пакажыце гэтыя вырабы на карцінках.
- Хто вырабляў з жалеза прыгожае аздабленне і гаспадарчыя прылады?

Рэчы гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза рабілі кавалі. Яны выкоўвалі сякеры, косы, нажы, нажніцы, цвікі, замкі, ключы, падкоўвалі коней. Кавалі рабілі сельскагаспадарчы інвентар, прылады хатняга ўжытку, дэталі ўпрыгожвання жылля  і мэблі. Пра працу каваля казалі, што “ Каваль куе, жалеза пяе”, “ У каваля рукі па локаць ў золаце”.  Рукі каваля параўноўваліся … *з золатам. ( тут і далей выхавальнік сваёй інтанацыяй запрашае дзетак да адказу).* І сапраўды , прыгожыя вырабы з жалеза маглі зрабіць толькі рукі добрага ... *майстра*.

***2. Адгадванне загадак***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У народзе кажуць ; “ З голымі рукамі нічога не зробіш”. Паспрабуйце адгадаць, пра якія гаспадарчыя прылады працы гаворыцца ў гэтых загадках.

Знойдзем адгадкі на загадкі пра вырабы з жалеза.

Маленькая, беленькая, увесь свет адзене.(Піла)
Сам драўляны, а галава жалезная( Малаток.)
Два канцы, два кальцы, а пасярэдзіне цвік.( Нажніцы.)
Без работы яна пацее і ржавее.( Сякера.)
Зубы вострыя мае, дробна жуе, а не глытае.(Піла.)
Цэлы дзень кланяецца, прыйдзе дамоў – расцягнецца.(Сякера.)
Маленькая, беленькая, увесь свет адзене.(Іголка.)
Бегла свінка, залатая спінка, ільняны хвосцік.( Іголка.)

**Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя “ Пра працу гутнікаў”**

***1. Размова выхавальніка з дзецьмі.***

- “У нас каля паўсотні паселішчаў з назваю Гута. Гэта паселішчы: Гутка, Гутніца, Гутава, Гута Замошская. Гута Ляшчынская, Новая Гута, Старая Гута, Студзёная Гута. Яна ўтварылася ад слова гутнікі”.( паводле В. Віткі).
- А хто такія гутнікі? ( Майстроў і рабочых, якія вырабляюць шкло, завуць гутнікі).

“Дзе існуюць гэтыя паселішчы, там некалі былі шкляныя заводы. Некаторыя з гэтых заводаў існуюць і цяпер. Так шкляныя вырабы гуты “Нёман”, што на Гродзеншчыне, цяпер шырока вядомыя ў нас і за мяжою.” паводле В. Віткі).

- Якія вырабы са шкла ёсць у вас дома? Назавіце іх.
- Усе гэтыя вырабы зроблены гутнікамі.

Шкляныя вырабы гутнікі выдуваюць са шкла. Пад моцнай тэмпературай шкло становіцца вадкім. З дапамогай спецыяльнага прыстасавання з вадкага шкла выдуваюць розныя прыгожыя вырабы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2. *Выдуванне мыльных пузыроў.***

Гутнікі выдувалі прыгожыя вырабы. з вадкага шкла . Мы таксама будзем разам з вамі выдуваць, але не шкляныя вырабы , а мыльныя пузыры. Так, як мы выдуваем з вамі мыльныя пузыры, гутнікі выдувалі прыгожыя рэчы з шкла, якое таксама бывае вадкім, калі вельмі гарачае.

**3. *Гульня " Шкляное-жалезнае"***

- Я буду называць вам рэчы і кідаць мячык, калі рэч шкляная , то вы ловіце мячык рукамі, а калі жалезная, то не. ( шклянка, малаток, бакал, каструля, чыгун, ваза, слоік, відэлец, лыжка, бутэлька і г.д.)

**4. *Маляванне шкляных і жалезных вырабаў.***

- Падзяліце ліст паперы на дзве частскі. На адной намалюйце вырабы са шкла, а на другой – з жалеза. Раскажыце пра вырабы, якія вы намалявалі. Параўнайце вырабы паміж сабой.

**Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя " Праца бандароў, бортнікаў, сітнікаў, суднікаў"**

***1. Размова па тэме.***

- "Паселішча Бандары, пэўна ж, выславілася некалі майстрамі, якія рабілі на патрэбу людзям добрыя бочкі, цэбры, дзежкі."
- Хто такія бондары? ( Майстры, якія выраблялі драўляны посуд для хатняй гаспадаркі).
- З якіх парод дрэў вырабляліся кадушкі, вёдры, конаўкі і іншыя рэчы?
- Цяпер гэтымі вырабамі часцей карыстаюцца ў вёсцы, ці іх можна ўбачыць ў краязнаўчым музеі.
- Драўляны посуд для бытавых патрэб выраблялі з розных парод драўніны.
- З дубу рабілі вёдры, кубельцы і дзежкі, бочкі і кадкі пад квас, сок, грыбы, гародніну. З сасны найчасцей выраблялі цэбры, балеі, кублы.
- З асіны – бочкі пад капусту. Але лепшым драўляным матэрыялам для вады і вадкіх рэчываў была елка. Драўніна яе вызначалася цвёрдасцю і была

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

менш успрымальнай да вільгаці. Не сілаю, а розумам выраблялiся ўсе гэтыя рэчы.

- “У Бортніках не зводзіліся знаўцы, якія ведалі, дзе, у якіх лясах поўна ў дуплах дзікіх пчол. Паступова прывучалі іх насіць мёд у вуллі-борці, што рабілі з тоўстых калод і ставілі на дрэвах, каб мядзведзь не дастаў”.
- “Сітнікі выраблялі сіты і рашоты.
- Суднікі – драўляны посуд: лыжкі, міскі, каўшы, кадаўбцы”.

( Тут і ў далейшым пры расказванні пажадана паказаць малюнкі з выявамі рамесніцкіх вырабаў ці, калі гэта магчыма, самі вырабы. )

***2. Гульня “ Хуткія вочы”***

- Я вам буду паказваць вырабы майстроў, а вы іх называць. Хто першы назаве – той атрымае фішку.

- А цяпер пагуляем інакш. Я вам буду паказваць дрэва, а вы будзеце паказваць і называць рэчы, якія з гэтага дрэва рабілі майстры.

***4. Прыказкі і прымаўкі пра працу***

- Паслухайце прыказкі і прымаўкі пра працу.
- Справа майстра … баіцца.
- Дзе праца – там густа, а дзе лянота – там … пуста.
- Неадкладвай на заўтра, што можна было зрабіць… сёння.

**Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя “ Праца ганчароў”**

***1. Размова па тэме.***

Гаспадарчыя і дэкаратыўна-прыкладныя вырабы з гліны выконвалі ганчары. Посуд рабілі у розных мясцовасцях, таму ён адрозніваўся сваёй формай і аздабленнем. Кераміка падзялялася на гартаваную, паліваную, чорназадымленую.

Гарлачы прызначаліся для захавання малака і малочных прадуктаў.

Гаршкі рабілі для гатавання гарачых страў. У іх варылі дзецям кашу. Два ці тры змацаваныя ручкай гаршка называлі спарышамі, яны ўжываліся для таго, каб занесці ежу ў поле.

У гляках захоўвалі алей, квас, ваду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З той жа мэтай, што і гарлачы выкарыстоўваліся збанкі, але яны выдзяляліся выцягнутым тулавам, звужаным горлам, дзюбкай і вушкам-ручкай.

У слоіках захоўвалі мёд, тлушч, смятану, варэнне і іншыя прадукты. Бакі ў слоіках былі цукатыя, радзей прамыя, горла шырокае. Часам яны мелі адно ці два вушкі.

Макацёр уяўляў сабою гліняную пасудзіну з шырокім вусцем, якая ў асноўным выкарыстоўвалася для расцірання прадуктаў, а таксама для гатавання ежы ў печы, заквашвання цеста.

Кубкі( конаўкі, кварты) прызначаліся для таго, каб піць з іх ваду. Яны мелі цыліндрычную ці бочкападобную форму і ручку.

Традыцыйным ганчарным вырабам былі міскі, якія ўяўлялі сабой глыбокую, круглую пасудзіну для ежы.

**2. Гульня " Падбяры пару"**

- У вас і ў мяне аднолькавыя картачкі з выявамі ганчарных вырабаў. Я буду паказваць картачку з выявай ганчарнага вырабу, а вам трэба знайсці такую ж , назваць выраб і паказаць яго.

**3. Гульня " Гарлачыкі".**

А цяпер, пагуляем разам у "Гарлачыкі". Выбярэм " маці", "дачку" і " ката". Усе астатнія – "гарлачыкі".

Маці гаворыць :

-Вось там будзе склеп. А вось тут – наша хата. Ідзіце, гарлачыкі, у хату!

Гарлачыкі прышлі ў хату і спыніліся.

Маці гаворыць:

- Дапамажы мне, дачушка, гарлачыкі ў склеп аднесці! Маці і дачка бяруць па два дзіцяці за рукі і вядуць іх да склепа (нясуць гарлачыкі), так яны ходзяць, пакуль не перанясуць усе гарлачыкі ў склеп. Там гарлачыкі сідзяць на кукішках.

Маці гаворыць дачцэ:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Я пайду ў поле на работу, а ты вартуй гарлачыкі. Глядзі, каб кот у склеп не залез і гарлачыкі не перакуліў.

Маці адыходзіць, а дачка, крыху пачакаўшы, ідзе да сяброўак.

Кот, азірнуўшыся па баках, увкаходзіць у склеп, абыходзіць гарлачыкі і гаворыць:

- Гэта смятанка! І – раз лапкай – перакульвае.
- Гэта сыроватка! І – раз лапкай – перакульвае.
- Гэта тваражок! І – раз лапкай – перакульвае.

У гэты час прыходзіць маці, бачыць перакуленыя гарлачыкі, кліча дачку і яны пачынаюць лавіць ката. Калі яны не могуць злавіць, то клічуць на дапамогу гарлачыкі. Усе дзеці бяруцца за рукі і ловяць ката ў сетку. Кот лічыцца злоўленым, калі вакол яго ўдзельнікі гульні сашчэпяць рукі.

**3. Закончы прыказку.**

Пра чалавека працы існуе шмат прыказак. Паслухай іх , закончы і растлумач, як ты разумееш іх сэнс.

Дзе няма ахвоты, там няма ... *работы.*

Дзе шчырая праца – там густа, а дзе лянота – там ... *пуста.*

Які рамеснік, такая ... *работа.*

Рамясло піць, есці не просіць, а само ... *корміць.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя “ Плеценыя рэчы ў гаспадарцы”

***1. Размова па тэме.***

Плеценыя рэчы на Беларусі выраблялiся з лазы, саломы, чароту, каранёў дрэў, лыка, бяросты, лучыны.

З лазы рабілі мэблю( крэслы, калыскі, падстаўкі пад вазоны).

З саломы плялі шкатулкі, цацкі, сумкі, капялюшы.

З сасновай лучыны выраблялі посуд для таго, каб пакласці садавіну, агародніну.

Бяроста была добрым матэрыялам для пляцення кашалей, сумак, вярэнек. Гэтыя ж вырабы плялі і з рагозу. Вярэньку выраблялі таксама з лубу, лазы. Яна ўяўляла сабой плеценую каробку круглай, авальнай ці прадаўгаватай формы з адной ці двума ручкамі і прызначалася для пераноскі прадуктаў ці гародніны.

З карэньчыкаў хваёвых дрэў плялі карзінкі, фруктоўніцы. З лыка— лапці. Плеценымі рэчамі было зручна карыстацца, яны лёгкія і не разбіваліся.

***2. Гульня " Падбяры матэрыял, з якога зроблена рэч"***

Выбярыце любую плеценую рэч, назавіце яе і матэрыял, з якога яна зроблена.

***3. Гульня " Падбяры рэч да пэўнага матэрыялу"***

Паглядзіце на гэтую саломку і знайдзіце ў групавым пакоі ўсе вырабы з залатой саломкі, назавіце іх.

***3. Прыказкі і прымаўкі пра працу.***

Паслухайце прыказкі пра працу.

Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш.

Праца чалавека корміць, а лянота порціць.

**Камунікатыўна-адукацыйная сітуацыя " Ткацтва на Беларусі"**

***1. Размова па тэме.***

Ткацтва было распаўсюджана на Беларусі Тканіну рабілі з пянькі, воўны, лёну. Ткалі адзенне, ручнікі, абрусы, посцілкі. Упрыгожвалі рэчы ўзорам.

Беларускія народныя ўзоры на тканінах вызначаліся сваёй прыгажосцю. Геаметрычны ўзор складаўся з шашачак, кругоў, прамавугольнікаў розных памераў, квадратаў. Яскравасць узору надавалі каляровыя ніткі.

Вышыванне і вязанне было адным з любімых заняткаў жанчын. Чырвона-чорныя вышытыя ўзоры на ручніках, кашулях, бялізне здзіўляюць сваёй прыгажосцю. Праца чалавека красіць і славіць.

**2. Упрыгожванне ручнікоў, кашуль, спадніц.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Упрыгожце ўзорамі ручнікі, кашулі, спадніцы. Выкарыстоўвайце фарбы беларускага арнаменту.

**3. Гульня “ Фарбы”.**

Пагуляем у “Фарбы”. Выбярэм гаспадара фарбаў і адгадчыка Яся. Усе астатнія будуць фарбамі.

Ясь адыходзіць у бок, а гаспадар і фарбы ціхенька агаварваюцца, хто будзе якой фарбай.

Гаспадар павінен добра запомніць, хто з гуляючых, якая фарба .

Калі колеры размеркаваны, фарбы і гаспадар прысаджваюцца на кукішкі і робяць выгляд, што засынаюць.

Тут прыходзіць Ясь. Падыходзіць, стукае некалькі разоў у дзверы і кажа:

- Тук – тук!

Гападар прчынаецца, устае і пытаецца:

-Хто там?

- Гэта Ясь!

- З чым прыйшрў?

- Па фарбу!

- Па якую?

Ясь называе які-небудзь колер, напрыклад:

- Па сінюю!

Калі такога колеру сярод фарбаў няма, гаспадар кажа:

- Такой фарбы ў нас няма!

А ўсе фарбы пляскаюць у далоні і прыгаворваюць:

Пайдзі за сіненькі лясок,<br>Знойдзеш сіні чабаток,<br>Панасі, панасі,<br>І нам прынясі.

Ясь адыходзіць убок, потым зноў вяртаецца і вядзе з гаспадаром ранейшую гутарку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Калі фарба, якую просіць Ясь, ёсць, ён уводзіць яе ў хату, а потым зноў вяртаецца да гаспадара па новую фарбу. Калі Ясь забярэ ад гаспадара ўсе фарбы , гульня канчаецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ